*А.І. Смолік, прафесар*

# ТЫПАЛОГІЯ САЦЫЯДЫНАМІКІ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ

Рэаліі XXI ст. змянілі нашы ўяўленні аб заканамернасцях развіцця соцыуму. Свет стаў прынцыпова іншым. Культурфіласофскія канцэпцыі, у якіх утрымліваюцца ідэі, прынцыпы ўладкавання грамадства, мадэлі будучага развіцця чалавецтва, мала што праясняюць у сучасных працэсах і з'явах грамадскага жыцця. Мадэлі касмаполісу, універсалізму і еўропацэнтрызму не ўпісваюцца ў сучасны беспрэцэдэнтны супярэчлівы сацыякультурны працэс. Не вытрымала жыццёвага выпрабавання сацыялістычная мадэль пабудовы ўзаемаадносін паміж этнасамі на аснове да крайнасці гіпертрафіравана міфалагізаванага культурна-антропнага пафасу.

Пэўны час усходняй цывілізацыі настойліва прапаноўвалася еўропацэнтрысцкая мадэль арганізацыі грамадства. Згодна з гэтай культурфіласофскай канцэпцыяй Еўропа з уласцівым ёй духоўным укладам з'яўляецца цэнтрам сусветнай культуры і цывілізацыі. Прагрэс уяўляўся як паступовае пранікненне еўрапейскай цывілізацыі ва ўсе рэгіёны свету. Сапраўды ў XX ст. еўрапейская цывілізацыя дасягнула значных поспехаў. Так, швейцарскі філосаф Г.Эйхельберг параўноўвае гісторыю чалавецтва з бегам на 60-кіламетровую дыстанцыю, пры гэтым умоўна прыраўноўвае 10 тыс. гадоў да 1 км. Большая частка гэтай дыстанцыі апынецца за межамі цывілізацыі. Толькі на 58-м кіламетры з'явяцца першыя прылады працы і пячорныя малюнкі. На 60-м кіламетры ўзнікае земляробства, за 200 метраў да фінішу сфарміруецца рымская цывілізацыя. Апошнія 10 метраў будуць адзначаны з'яўленнем газнай лямпы, і толькі на самым фінішы еўрапейцы пачнуць выкарыстоўваць электрычную энергію, навучацца кіраваць тэрмаядзернымі працэсамі, асвойваць космас і г.д. Адным словам, у XX ст. еўрапейцы стварылі тэхнагенна-спажывецкую цывілізацыю, дзе эканоміка адыгрывае выключную ролю. Укараненне ў быццё прынцыпу першынства эканомікі над іншымі сферамі сацыяльнага жыцця спарадзіла прымітыўны тып чалавека – Homo economicus, для якога прыбытак і грошы сталі меркай, матывацыяй жыццёвых арыентацый і ўчынкаў. У еўрапейскай індустрыяльнай цывілізацыі амаль усё, у тым ліку чалавечае цела, дух і душу, разглядаюць праз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызму камерцыйнага інтарэсу, запамятаўшы, што эканоміка толькі частка грамадскага жыцця.

Аднак сацыяльна-палітычныя і эканамічныя падзеі XX ст. разбурылі ўяўленні аб прагрэсе як адзіным універсальным інструменце сацыяльнага ўладкавання свету. Імкненне шэрага еўрапейскіх краін да сусветнага лідэрства, да права праектаваць і мадэліраваць будучае ўсяго чалавецтва (Германія, Італія, СССР і інш.) прывялі да дзвюх сусветных войнаў, шэрага рэвалюцый. У выніку толькі Другой сусветнай вайны загінулі звыш 100 млн еўрапейцаў (у войнах XVII ст. загінулі 3 млн, XVIII – 5 млн, XIX – 10 млн). XXI ст. яшчэ больш пераконвае нас у тэарэтычнай неадпаведнасці, неуніверсальнасці і новай практычнай шкодзе тэорыі прагрэсу [3, с. 8].

Драматызм навукова-тэхнічнага прагрэсу заключаецца ў тым, што ў XX ст. яго вынікамі карыстаўся толькі "залаты" мільярд (15–20% англасаксонскага насельніцтва) з 6-мільярднай колькасці насельніцтва. У той жа час, як адзначаецца ў дакладзе ААН "Выклік трушчоб", існуе мільярд трушчоб. Збыліся прадказанні М.Бярдзяева, які пісаў, што ідэя прагрэсу дапусціць на пір толькі невядомае пакаленне шчаслівцаў, якое з'явіцца вампірам у адносінах да ўсіх папярэдніх пакаленняў.

Такім чынам, еўрапацэнтрызм з яго глабальным навукова-тэхнічным прагрэсам не выклікае ўсеагульнага аптымізму. Насупраць, у значнай частцы этнасу ён параджае субстанцыяльны непакой, душэўную трывогу, адчуванне надломленасці і кволасці быцця, бед і катастроф, "смутнага часу". Вядомы сацыёлаг А.Печэі піша: "У гісторыі цяжка знайсці другі перыяд, калі людзі глядзелі б у будучыню з такой трывогай. На самай справе, гэта падобна на вяртанне да сярэдніх вякоў, калі розум чалавека быў ахутаны страхам перад наступленнем новага тысячагоддзя" [2].

Што сёння можна вылучыць у якасці альтэрнатывы еўрапацэнтрызму? Па якому шляху развіцця павінны рухацца народы да духоўна-экалагічнай цывілізацыі? У цяперашні час значная частка футуролагаў звязвае свае надзеі з трансфармацыяй постіндустрыяльнага грамадства, акцэнтуючы ўвагу не на новым вітку навукова-тэхнічнага прагрэсу, а на фарміраванні ўнутранага свету чалавека, новых каштоўнасцей, сэнсу жыцця, ідэалаў. Чалавецтва зможа выжыць, калі адбудуцца духоўная рэфармацыя, светапоглядная каштоўнасная рэвалюцыя, роўная па маштабах і значэнні эпосе Адраджэння. Але змест яе павінен быць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпова іншым. Названая рэвалюцыя павінна сцвердзіць новыя культурныя каштоўнасці, новую светапоглядную сістэму каардынат, перагляд ідэалаў, якія арыентаваны на сілавое пераўтварэнне навакольнага свету, на тэхналагічную актывізацыю і выпрацаваць культурныя процівагі і абмежаванні тэхнагеннай цывілізацыі.

Значная частка культурфілосафаў спадзяецца прывесці чалавецтва да гарманічнага і несупярэчлівага існавання шляхам стварэння поліцэнтрычнай геаструктуры свету. Такі варыянт тэарэтычна магчымы. Ужо сёння паралельна з цэнтрам сілы на чале з ЗША складваюцца некалькі новых цэнтраў сілы вакол Кітая, Расіі, Бразіліі, Індыі і інш. Дэніэл Бэл у свой час пісаў, што рэгіёны з'яўляюцца тымі палітычнымі, сацыяльнымі і культурнымі адзінкамі, з якіх будзе будавацца свет XXI ст. Але, як паказвае практыка, баланс палітычных і эканамічных сіл у любы момант можа парушыцца. Вопыт разбурэння біпалярнага свету СССР – ЗША – сведчанне гэтаму няўстойліваму развіццю.

Шырокую папулярнасць у наш час атрымала глабалізацыйная парадыгма, згодна з якой сацыякультурная дэканструкцыя магчыма на аснове злому традыцыйных тэрытарыяльных, этнакультурных і дзяржаўна-палітычных бар'ераў, якія раздзяляюць народы. Заходнія даследчыкі разглядаюць глабалізацыю як фатальна прадвызначаны, непазбежны працэс, што нівеліруе ўсе магчымыя нацыянальныя адрозненні – ад эканамічных да культурных. Сапраўды, у эканамічнай сферы адбываецца фарміраванне глабальнай эканомікі, адзінага планетарнага рынку. Сёння 37 тыс. транснацыянальных карпарацый і 20 тыс. філіялаў стварылі адзіную сістэму, якая ахоплівае ўсю планету. Прыхільнікі глабалізму разглядаюць гэтую з'яву як у вышэйшай ступені прывабную, шлях павышэння жыццёвых стандартаў. Крытыкі глабалізму адзначаюць, што геаэканамічныя гіганты (ТНК) аслабляюць і нярэдка знішчаюць нацыянальную эканоміку краін. Сапраўды, аналіз узроўню жыцця насельніцтва краін "залатога мільярда" з астатнімі краінамі свету сведчыць: разрыў ва ўзроўні жыцця паміж 5 багацейшымі краінамі і 5 бяднейшымі складае 74:1 [3, с. 159].

Давайце паглядзім на глабалізацыю ў кантэксце культуры. Аксіёмай з'яўляецца тэзіс, што цывілізацыйныя перспектывы развіцця грамадства заўсёды неабходна разглядаць у духоўным

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

кантэксце, таму што духоўны стан соцыуму, які з'яўляецца глыбінным вымярэннем яго быцця, здольны кардынальным чынам паўплываць на гістарычны лёс і жыццёвыя перспектывы народа. Як і ў эканамічнай сферы, краіны-лідэры імкнуцца сфарміраваць адзіную глабальную культуру. Якія ж духоўныя асновы, навацыі, маральныя ўстаноўкі глабальнай культуры? Параўнальны аналіз духоўна-светапоглядных установак, прапанаваных глабалізацыяй, паказвае, што гэта ёсць антытэза духоўнасці, агульначалавечым каштоўнасцям. Сучасны варыянт глабалізацыі энергічна падтрымлівае дух кансюмерызму, гэта значыць спажывецкага інтарэсу над усімі астатнімі вітальнымі і сацыяльнымі матывамі чалавечай дзейнасці. Спажывальніцтва разглядаецца ідэолагамі глабальнай культуры як універсальная звышкаштоўнасць. Так, Аталі, дырэктар Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, у кнізе "Лініі гарызонта" называе грошы галоўнай і універсальнай каштоўнасцю, у тым ліку і духоўнай. Глабальная культура ставіць мэтай фарміраванне эканамічна арыентаванай асобы, для якой звышрацыянальныя катэгорыі дабра, справядлівасці, сумлення, любові і веры маюць не проста другаснае значэнне, а наогул становяцца ўвасабленнем архаічных праяў асобы: у прасторы глабальнай культуры свет каштоўнасцей, этнічных нормаў, духоўнай арыентацыі паступова выцясняецца са свядомасці як не маючы практычнага выкарыстання, як нерэнтабельны і эканамічна некарысны.

Культура як спосаб засваення свету ўяўляе перш за ўсё культуратворчую дзейнасць, вынік якой вымяраецца ў сукупнасці створаных і назапашаных чалавецтвам духоўных багаццяў. Таму канцэпцыя глабальнай культуры мае сёння больш праціўнікаў, чым прыхільнікаў. Крах еўропацэнтрызму, універсалізму, еўразійства пацвярджае думку, што на самай справе няма і не можа быць універсальнай культуры, культуры ўсіх культур. "Культура не можа быць універсальнай, – адзначае Ж.Элюль, – паколькі чалавек не універсальны. Ён жыве ў пэўным месцы і часе, характарызуецца гістарычнай, этнічнай спецыфікай". Універсальная, у тым ліку і глабальная, культура – гэта псеўдакультура, гэта значыць на самай справе смерць культуры этнічнай, нацыянальнай. Таму ў процівагу ідэі глабальнай культуры ўзнікаюць парадыгмы, якія абараняюць нацыянальныя культуры. Такой, напрыклад, з'яўляецца канцэпцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

афрацэнтрызму, у аснову якой пакладзена спецыфічная светапоглядная ўстаноўка, скіраваная на каштоўнаснае ўзвышэнне афрыканскай культуры. Адзін з аўтараў абазначанай канцэпцыі філосаф Л.Сенгор спецыфіку негрыцянскай культуры бачыць у тым, што для негра на першым месцы заўсёды форма і колер, гук і рытм, пах і датыканне. Такое светаадчуванне Л.Сенгор супрацьпастаўляе заходняму, рацыяналістычнаму. Тэарэтыкі афрацэнтрызму разглядаюць еўрапейскага чалавека адмоўна ў каштоўнасных адносінах як непараўнальнага з афрыканцам.

Аналагічная гісторыка-культурная, светапоглядная рэакцыя на асобу глабальнай культуры праяўляецца ў Азіі, Блізкім Усходзе. Паэтызацыя этнічнай культуры знаходзіць яскравае выражэнне ў імкненні Японіі вярнуцца ў Азію, у “індуізацыі” Індыі, рэісламізацыі Блізкага Усходу.

Рэспубліка Беларусь таксама распрацавала і ўкараняе ў жыццё мадэль інавацыйнага развіцця, якая прадугледжвае комплексную мадэрнізацыю прамысловых прадпрыемстваў, стварэнне інавацыйнай інфраструктуры. У сацыякультурнай сферы адбываецца пошук духоўных асноў быцця, якія б садзейнічалі ўмацаванню культурнага патэнцыялу краіны, забяспечылі бесканфліктнае суіснаванне этнасаў з рознымі каштоўнасна-сэнсавымі ўстаноўкамі. Шэраг беларускіх культурфілосафаў лічаць, што ў перыяд грамадскіх трансфармацый, якія адбываюцца цяпер у Беларусі, ёй найбольш адпавядае транзітыўная полікультурная мадэль. Культурны поліморфізм абумоўлены этнічнай і канфесіянальнай разнастайнасцю. Так, у пачатку XXI ст. у Беларусі налічвалася 2953 рэлігійныя абшчыны, у іх ліку 1399 праваслаўных, 440 каталіцкіх, 13 грэка-каталіцкіх, 29 іудзейскіх, 24 ісламскія. У Рэспубліцы Беларусь пражываюць 417,8 тыс. палякаў, 1142 тыс. рускіх, 27 810 яўрэяў, 10 089 татараў і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей і этнічных груп [1, с. 7]. Як бачна, сучаснае беларускае грамадства сацыяльна разнастайнае і стварае глебу для фарміравання полікультурнай мадэлі. На наш погляд, разнастайнасць культурных формаў дае чалавеку магчымасці духоўнага развіцця, вызначыць тып, формы культуры, у якіх ён зможа самаактуалізавацца. Поліморфізм культуры дазваляе шматлікім этнічным групам без супярэчнасцей уключыцца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дамінантную культуру, паступова змяніць існуючыя стэрэатыпы культурных каштоўнасцей і нормаў на новыя.

1. *Землякоў, Л.* Дзяржаўна-канфесіянальная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь // Л.Землякоў, Н.Колікава // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 3. – С. 3–8.

2. *Печчеи, А.* Вызов 70-х годов современному миру / А.Печчеи // Римский клуб. История создания: избранные доклады и выступления, официальные материалы. – М.: Мысль, 1997. – 318 с.

3. *Современные* глобальные трансформации и проблема исторического самоопределения восточнославянских народов: монография / Ч.С.Кирвель [и др.]; под науч. ред. Ч.С.Кирвеля. – Гродно: ГрГУ, 2008. – 532 с.

4. *Ellul, J.* Pent-il exister une culture technicienne? / J.Ellul // La technique. Cahiers Jacques – Ellul. – Bordeaux, 2004. – № 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ